Інфармацыйны ліст

**Нацыянальная акадэмія навук Беларусі**

**Інстытут гісторыі НАН Беларусі**

Запрашаем прыняць удзел у V Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі

**"Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 95-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)"**

Час правядзення: 15–16 кастрычніка 2024 г.

Месца правядзення: Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі

**Праблемнае поле кангрэса:**

1. *Метадалогія, гістарыяграфія, крыніцазнаўства і археаграфія: тэорыя, канцэпцыі, дасягненні.*
2. *Даследаванні ў галіне беларускай археалогіі.*
3. *Спецыяльныя гістарычныя навукі Беларусі: стан і перспектывы даследаванняў.*
4. *Гісторыя навукі: актуальныя напрамкі даследаванняў.*
5. *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці – аснова дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь.*
6. *Этнагенез на беларускіх землях – перадумова ўзнікнення першых дзяржаўных утварэнняў.*
7. *Гістарычныя формы беларускай дзяржаўнасці.*
8. *Беларускія землі ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу.*
9. *Сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі і грамадска-культурныя змены ў Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.).*
10. *Генезіс беларускай нацыі і нацыянальнай ідэі.*
11. *Беларуская нацыянальная дзяржаўнасць у XX ст.*
12. *Суверэнная Рэспубліка Беларусь – вышэйшая ступень рэалізацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.*
13. *Беларусь у войнах і ваенных канфліктах XIX–XX ст.*
14. *Беларусь у сістэме міжнародных адносін.*
15. *Даследаванні ў галіне сусветнай гісторыі.*
16. *Укараненне канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў навучальна-выхаваўчы працэс школ, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.*
17. *Методыка выкладання гісторыі ў навучальных установах.*
18. *Фарміраванне гістарычнага светапогляду маладога пакалення.*

***Па матэрыялах кангрэса запланавана выданне зборніка.***

Рабочыя мовы: беларуская, руская, англійская.

Заяўкі для ўдзелу ў кангрэсе і тэзісы дакладаў прымаюцца да **15 верасня 2024 г.** на адрас аргкамітэта: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1; кантактны тэл. +375 (17) 379-16-10, факс +375 (17) 379-18-34; e-mail: modernhistbel@mail.ru.

У заяўцы неабходна ўказаць імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго вучоную ступень і званне, назву даклада, назву ўстановы, якую прадстаўляе

дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail, форму ўдзелу, а таксама патрэбнасць у тэхнічных сродках суправаджэння. Поўная форма заяўкі змяшчаецца ў дадатку 1.

Студэнтам, магістрантам і аспірантам разам з заяўкай неабходна даслаць тэзісы даклада (да 2000 знакаў) і водгук навуковага кіраўніка.

Замежных удзельнікаў просім паведаміць аб неабходнасці атрымання візавай падтрымкі.

Даклад аб'ёмам да 6 (шасці) старонак адзінарным інтэрвалам фармату А4 (210Х297 мм) павінен быць набраны ў рэдактары Times New Roman памерам 14 без пераносаў. Палі: верхняе, ніжняе – 20 мм, левае – 30 мм, правае – 10 мм. На першым радку ўказваецца індэкс УДК (выраўноўванне па левым краі). Другі радок – назва матэрыялу малымі літарамі паўтлустым шрыфтам (па цэнтры). Трэці радок – справа прозвішча (прозвішчы) і ініцыялы аўтара (аўтараў), назва ўстановы (скарочана); з новага радка пры неабходнасці адзначаецца навуковы кіраўнік – яго вучоная ступень, вучонае званне, прозвішча і ініцыялы. Праз радок друкуецца тэкст даклада (абзацны водступ 1,25 см). Спасылкі на літаратуру даюцца ў квадратных дужках. Табліцы ўстаўляюцца ў тэкст. Пасля асноўнага тэксту прыводзіцца спіс літаратуры ў алфавітным парадку. Літаратура афармляецца згодна з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 25.06.2014 № 159 (у рэдакцыі загаду Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь 08.09.2016 № 206). Узор афармлення даклада змешчаны ў дадатку 2.

Запрашэнні для ўдзельнікаў кангрэса будуць разасланыя пасля разгляду заявак да **7 кастрычніка 2024 г.**

***Выдаткі, звязаныя са знаходжаннем на кангрэсе, бярэ на сябе камандзіруючы бок.***

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў.

Дадатак 1.

**Форма заяўкі**

Прашу ўключыць мой даклад у праграму V Міжнароднага кангрэса гісторыкаў Беларусі **"Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 95-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)"**

| | |
|---|---|
| Прозвішча Імя Імя па бацьку | |
| Назва даклада | |
| Месца працы або вучобы (поўнае найменне ўстановы і яе падраздзяленні) | |
| Пасада | |
| Вучоная ступень | |
| Вучонае званне | |
| Праблематыка (пазначыць № раздзела з праблемнага поля) | |
| Выкарыстанне тэхнічных сродкаў (калі так, то паказаць якія) | |
| Адрас для сувязі (+ індэкс) | |
| Тэлефон | |
| E-mail | |
| Форма ўдзелу (вочная / завочная / он-лайн) | |

Дадатак 2

**Прыклад афармлення**

УДК

**Назва даклада**

Іваноў І.І. (Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова", г. Магілёў, Беларусь)

Навуковы кіраўнік - доктар гістарычных навук, прафесар Сідараў Г.У.

Тэкст даклада [1, с.24].

Літаратура:

1. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі /А. Мальдзіс. – Мінск: Лімарыус, 2001. – 384 с.